Емялёва Г.Ю., магістрант
БДУ культуры і мастацтваў
Навуковы кіраўнік – Шалупенка Н.Я.,
кандыдат культуралогіі, дацэнт

# МІФАЛОГІЯ ЯК АСНОВА ТРАДЫЦЫЙНАЙ КУЛЬТУРЫ

Міфалогія – сістэма сакральных ведаў пэўнага традыцыйнага грамадства. У традыцыйных культурах яна ўяўляе сабой цэльную, унутрана лагічную сістэму, своеасаблівы эквівалент навукі, што тлумачыць свет ва ўсёй яго цэласнасці, але сутнасць з'яў тут спасцігаецца не праз паняцці, а праз вобразы. Менавіта дзякуючы міфалогіі фармуецца светапогляд традыцыйнага чалавека, які далей актуалізуецца ў ягонай дзейнасці. У культуры, у тым ліку і традыцыйнай, якую можна разглядаць як "рэальнасць, элементы якой маюць спецыфічнае, двайстае існаванне: яны не проста існуюць наяве, але яшчэ і штосьці значаць для чалавека, з'яўляюцца носьбітамі пэўных сэнсаў, існуюць сімвалічна" [4, с. 10], сэнсы, што надаюцца элементам гэтай рэальнасці, фармуюцца на аснове міфалогіі, увесь час суадносяцца з ёй.

У традыцыйнай культуры міфалогія непарыўна звязаная з назіраннямі чалавека за Сусветам і прыродай. "Супастаўляючы і аналізуючы з'явы і прадметы, чалавек заканамерна прыходзіў да высновы, што існуе нейкая ўніверсальная першааснова быцця, з якой некалі ўзнікла ўсё існае і да якой зноў усё вяртаецца ў часы, гэтаму адпаведныя; існуе глыбіннае адзінства ўсяго існага дзякуючы існаванню вечнай касмічнай субстанцыі, якая нараджае ўсе рэчы гэтага свету" [2, с. 14]. Для чалавека традыцыйнай культуры сам свет свяшчэнны, і ўсё ў ім існуе ў цесным узаемадзеянні і падпарадкоўваецца адзіным законам. С. Санько піша: традыцыйны светагляд спрэс прасякнуты тэмай Космасу - максімальна структураванай, уладаванай і згарманізаванай глабальнай цэласці, прыроду якой спадкаемяць усе без выняткаў сістэмы меншага парадку, у тым ліку сацыяльныя сістэмы (этнас,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

род, сям'я і інш.) і сам чалавек /4, с. 58/. Прырода, соцыум і чалавек для міфалагічнай свядомасці ў аснове сваёй адзіныя, прыналежныя адно аднаму і непарыўна звязаныя. “У міфічнай свядомасці свет паўстае як жывы, інтэграваны арганізм са шматузроўневымі залежнасцямі паміж яго часткамі” [3, с. 28]. Менавіта дзякуючы такому ўспрыняццю быцця для чалавека традыцыйнай культуры “свет ужо не ёсць непранікальная маса аб’ектаў, адвольна спалучаных разам, але жывы Космас, упарадкаваны і поўны сэнсу. У выніку свет раскрывае сябе як мова. Ён “размаўляе” з чалавекам сваім асабістым спосабам існавання, сваімі структурамі і сваімі рытмамі” [5, с. 144]. І праз тое, што чалавек улучаны ў Сусвет і з’яўляецца ягонай часткай, на гэтай жа мове ён імкнецца размаўляць з Сусветам, наладжваючы камунікацыю з дапамогай адмысловага медыятара - культуры, якая выступае як духоўная практыка чалавека па спазнанню Сусвета і якая створана і функцыянуе па ўзору і па законах самога Сусвету. Верагодна, асноўная функцыя і міфалогіі, і традыцыйнай культуры наогул – навучыць чалавека ўспрымаць свет менавіта такім чынам і дзейнічаць у адпаведнасці з гэтымі ведамі, каб сінхранізаваць і згарманізаваць быццё ад макраўзроўняў да мікраўзроўняў.

Касмаганічныя міфы з’яўляюцца ядром міфалагічных сістэм розных традыцыйных культур. Яны распавядаюць аб тым, як з першапачатковага Хаосу ў выніку дзеянняў сакральных сіл быў створаны свет. Хаос быў упарадкаваны, прыведзены да пэўнай структуры і, такім чынам, пераўвасоблены ў Космас. Часта апавядаецца аб нараджэнні Сусвету з першасных водаў, аб нараджэнні свету з яйка, а таксама аб стварэнні свету як стварэнні тканіны ці прадзенні ніткі. Парэшткі гэтых сюжэтаў можна знайсці і ў беларускім фальклоры, напрыклад, у легендзе аб паходжанні беларусаў кажацца так: “Калісь ящчэ свет толькі зачынаўся, дык нічога нідзе не было. Усюды стаяла мёртвая вада. А пасярод вады тырчэў нібы камень, нібы щто. Адзін раз пярун як разыграўся і давай пыляць стрэламі ў гэты камень. Ад яго стрэл выскачыла тры яскаркі: белая, жоўтая і чырвоная. Упалі тыя яскаркі на

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ваду; з гэтага ўся вада скаламуцілася, і свет памуціўся, як хмары. Але па некаторым часе, як усё высветлілася, дык і адзначылася - дзе вада, дзе зямля. А яшчэ па некаторым часе завялося і ўсякае жыццё і ў вадзе, і на зямлі. І лясы, і травы, і звяры і рыбы, а пасля і чалавек завёўся: ці ён прыйшоў адкуль, ці вырас тутака” [1, с. 76].

Міфалагічная мадэль свету, што паўстае ў выніку касмагоніі, адлюстоўвае своеасаблівую “сістэму каардынат” пэўнай культуры, з якой чалавек суадносіць ўсе элементы існуючай рэальнасці. Так, ў беларускай традыцыйнай культуры свет часцей за ўсё падзяляецца на тры часткі - верх, сярэдзіну і ніз. З верхам, што сімвалізуе мужчынскі пачатак, суадносяцца, напрыклад, неба, дзень, агонь, святло, правы бок, цотнасць, нябесны дождж, упарадкаванасць, апладатвараючы пачатак, бог маланкі, птушкі. З нізам, што сімвалізуе жаночы пачатак, суадносяцца зямля, вада, ноч, вільгаць, цемра, левы бок, няцотнасць, зямныя воды, хаос, пладаносны пачатак, цмок, хтанічныя істоты. Сімвалічным пасярэднікам паміж верхам і нізам з’яўляецца Дрэва Сусвету (Неба – Дрэва – Зямля і Вада / Неба - Дрэва пасярод Зямлі - Вада), адпаведнікамі якому могуць з’яўляцца гара, камень, курган, стоўб, ідал, царква, хата, крыж, чалавек і інш.

Стварэнне новых элементаў рэальнасці чалавекам традыцыйнай культуры адбываецца таксама па ўзоры касмагоній. Любы сімвалічны Хаос пераўтвараецца чалавекам у Космас з дапамогай узнаўлення, актуалізацыі касмагоніі, бо свет, створаны сакральнамі сіламі, ёсць ідэальны, найбольш гарманічны прыклад стварэння, ад якога паходзіць усё існае, усё жыццё. Усе складнікі міфалагічнай культуры – мова, сістэма абрадаў, грамадскі ўклад, лад жыцця, гаспадарчая дзейнасць чалавека і сямейны ўклад, рамёствы і тэхналогіі, архітэктура, прадметы побыту (транспарт, мэбля, посуд, інструменты, адзенне), харчаванне, медыцына, выхаванне, фальклор (музыка, літаратура, гульні, танцы) і інш. – непарыўна звязаныя з асноўнымі міфалагічнымі ўяўленнямі і ў той ці іншай ступені актуалізуюць, рэпрэзентуюць і транслююць міфалагічныя веды праз розныя коды.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Акрамя таго, узнаўляючы ў сваёй дзейнасці касмагонію, рэактуалізуючы міфы, чалавек традыцыйнай культуры рытуалізуе і сакралізуе ўсё сваё жыццё і выступае ў якасці творцы вышэйшага ўзроўню, паўтараючы дзеянні багоў. І гэтая актуалізацыя, у межах міфалагічнага мыслення, патрэбная не адно толькі для самога чалавека, але і наогул для існавання ўсяго Сусвету, цыклічнае быццё якога неабходна перыядычна падтрымліваць, бо Сусвет, што паводле міфаў нараджаецца ў выніку дзеянняў багоў, развіваецца, і памірае, можа зноў адрадзіцца толькі дзякуючы абрадаваму паўтарэнню чалавекам першаснай касмагоніі. “У старажытных тыпах грамадства ў аснове ўсеагульнага закону жыцця Сусвету ляжыць ідэя пастаяннага ўзнаўлення традыцыйнай формы. Асноўнай міфалагічнай мэтай чалавечай жыццядзейнасці з’яўляецца спазнанне рытмаў і цыклаў Сусвету, што развіваецца цыклічна, уключэнне ў гэтыя цыклы. Аснову ментальных установак чалавека традыцыйнага грамадства складае ідэя вечнага паўтарэння, а таксама ідэя нязначнасці асабістага гістарычнага лінейнага чалавечага жыцця ў параўнанні з быццём Космасу. Галоўнай каштоўнасцю быцця з’яўляецца спасціжэнне вышэйшага сакральнага сэнсу, а жыццё ўяўляе сабой бясконца ўзнаўляемы касмаганічны абрад, у якім удзельнічаюць і багі (сакральныя істоты), і людзі [2, с. 6]. Такая рытуалізацыя дазваляе чалавеку традыцыйнай культуры знаходзіцца ў адмысловым хранатопе міфа – у прасторы і часе Сусвету, якім ён быў ад пачатку, ад стварэння яго багамі ці першапродкамі – ідэальным, максімальна напоўненым, моцным, гарманічным, свяшчэнным. Менавіта ў такім свеце жыве чалавек міфалагічнай свядомасці, такім ён паўстае для яго. І менавіта так міфалогія, якой прасякнута ўся традыцыйная культура, сцвярджае чалавека экзістэнцыйна.

Спіс выкарыстанай літаратуры:

1. Легенды і паданні / [Склад. М.Я. Грынблат і А.І. Гурскі; рэд. тома А.С. Фядосік]. – 2-е выд., дап. і дапрац. – Мн.: Бел. навука, 2005.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

2. Міфалогія. Духоўныя вершы / А.М. Ненадавец, А.У. Марозаў, Л.М. Салавей, Т.А. Івахненка; навук. рэд. А.С. Фядосік. - Мн.: Бел. Навука, 2003.
3. Народная медыцына: рытуальна-магічная практыка / Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя Кандрата Крапівы НАН Беларусі; уклад., прадм. і паказ. Т.В. Валодзінай; навук. рэд. А.С. Ліс. – Мінск: Беларуская навука, 2007.
4. Санько С. Штудыі з кагнітыўнай і кантрастыўнай культуралогіі. – Мінск: БГАКЦ, 1998.

Элиаде М. Аспекты мифа / Пер. с фр. - М.: Академический Проект, 2000.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ